Цана асобнага нумару 1000 м. п.

НАШ СЬЦЯГ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **10.000** м. п.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 2500 мк., сярод тэксту 2000 м. і на 4 стр. 1500 м., за радок пэтыту у 1 шпальт.

№ 4 | Субота, 16-га чэрвеня 1923 г. | Год I.

Прымусовае самагубства.

Згодна з соймавымі пастановамі, абавязак закладаньня і утрымліваньня народных школаў ускладаецца на дзяржаўны скарб і на гмінныя самаўрады. Паскольку дзяржава аплачывае пэнсію вучыцялём, пастольку ўтрыманьне школаў, забясьпечаньне ім адпаведнага памяшчэньня і ўсе другія выдаткі павінна аплачываць гмінная рада.

З гэтага ясна, якую вялікую ролю павінны йграць гмінныя самаўрады ў справе шырэньня прасьветы. Яшчэ больш будзе гэта ясна, калі паглядзімо, якія сумы асыгнавалі гмінныя рады Віленшчыны на народныя школы ў сваіх бюджэтах на першую палову 1923 году. Паводле даных газэты „Głos Wilna“, на гэту мэту гмінныя самаўрады Віленска-Троцкага павету асыгнавалі 202 мільёны марак, або 34 процэнты ўсяго бюджэту, Дунілаўскага павету — 25 процэнтаў, Сьвянцянскага—24 пр. і Вялейскага — 16 пр.

Як ведама, пераважная большасьць насяленьня гэных паветаў—беларусы. Ня гледзячы на супярэчныя з гэтай нашай заявай цыфры ўрадовай статыстыкі, мы настаіваем на гэтым, бо маем бясспорны доказ нязгоднасьці з праўдай, як раз статыстыкі ўраду: гэта—вынікі выбараў у Сойм і Сэнат. Тымчасам народныя школы, утрымліваныя самаўрадамі, значыць, за грошы беларускага сялянства, зьяўляюцца бадай выключна польскімі. На ўсю Віленшчыну беларускіх школ набярэцца многа-многа 30 побач з сотнямі польскіх школ.

Як-жа гэта магло стацца? Нам вядомы сотні просьб сялян аб адкрыцьці ў іх школаў у роднай беларускай мове. Нам вядомы факты, што шмат дзе ў польскія школы нашы сяляне зусім не пасылаюць дзяцей, а ёсьць і такія, дзе на двух вучыцялёў налічаецца ня больш 5—10 вучняў. Дык як пагадзіць гэткія і ім падобныя факты з вышэйпаказанымі значнымі асыгноўкамі гмінных рад на ўтрыманьне школаў?

Адказ вельмі лёгка знайсьці. Справа ў тым, што так-званыя гмінныя рады ў Віленшчыне пераважна не зьяўляюцца самаўрадамі, ня выбраны самым насяленьнем, а назначаны польскаю ўладаю ў часох панаваньня ў нас пана Юрыя Асмалоўскага, начальніка Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich і правае рукі нядобрае для беларусаў памяці пана Язэпа Пілсудскага. У тыя часы (бадай так сама, як і цяпер) кожнага беларуса ўлада лічыла бальшавіком і дзеля гэтага ў гмінныя рады назначала выключна палякоў, ці зусім апалячаных беларускіх адступнікаў. Дык ясна, што такія „самаўрады“ нічога супольнага з народнымі масамі ня маюць, волі гэных масаў не выражаюць, а, наадварот, выпаўняюць толькі волю таго, хто іх назначыў. Гэтым тлумачыцца, чаму гмінныя рады адмаўляюцца зацьвярджаць пастановы вясковых грамад аб адкрыцьці беларускіх школ, чаму яны адкрываюць і падтрымліваюць за сялянскія грошы школы польскія, тымі-ж сялянамі байкатаваныя.

З гэтага беларускае грамадзянства павінна зрабіць свае вывады. Практыка паказала, што там, дзе адбыліся перавыбары гмінных рад, школьная справа стаіць зусім інакш: там бачым асыгноўкі не на польскія, а на беларускія школы (напр. у Радашкоўскай гміне і др.). Значыцца, **правядзеньне перавыбараў гмінных рад** на ўсіх беларускіх землях, пад Польшчай, **павінна стацца першым дамаганьнем беларускага грамадзянства і беларускіх паслоў у варшаўскім Сойме.** Толькі правядзеньне ў жыцьцё закона аб гмінным і павятовым самаупраўленьні на абшары ўсяе Заходняе Беларусі дасьць магчымасьць беларускаму насяленьню зьмяніць тое дзікае палажэньне, пры каторым **дэнацыяналізацыя нашага сялянства адбываецца за яго-ж уласныя грошы.**

Ведама, і гэта пры істнаваньні цэлае сыстэмы „націску“ на народ з боку адміністрацыі ня зьменіць палажэньня ў поўнай меры. Але ўсё-ж правядзеньне ў нас запраўднага самаупраўленьня палóжыць канец нашаму **прымусоваму нацыянальнаму самагубству** праз школу.

Ст. Мірскі.

Разгараецца.

У апошнія часы часта прыходзіцца спатыкацца з словам „фашызм“.

Што такое фашызм?

Як сапраўдны социялізм, дык і фашызм ёсьць рухам анты-дэмакратычным: мэтай яго барацьбы ёсьць дыктатура буржуазіі над пролетарыятам. Але бяда ў тым, што буржуазія хоць багата, але яе нямнога, тады як пролетарыяту нязьмерна больш, весь фашызм, каб умацаваць сваю дыктатуру, прыкінуўся у фальшывы дэмакратызм, каб такім чынам падысьці бліжэй да рабочай масы, адурманіць яе і з яе помачай умацаваць сваё панаваньне. На чале такіх псэўда-дэмакратаў стаіць у Польшчы даволі неўдалы Корфанты, у Італіі—Мусоліні і т. д.

Фашызм самы гарачы і рэвалюцыйны абаронца капіталу; ён прыгнячае ня толькі работніцкую клясу, але стварае і нацыянальны ўціск, падняволеньне,—пры гэтым маленькая групка людзей, ці адна дужэйшая нацыя эксплёатуе працоўных ці падняволеныя нацыі, абздзіраючы іх фізычна, прыгнечаючы ўмысьлова, спыняючы гэтым духоўны, культурны, а разам з тым і матэр'яльны поступ чалавецтва.

Гэты ўціск і эксплёатацыя вызывае абурэньне паняволеных, з чаго карыстае буржуазія, напраўляючы гэтае нездаволеньне на шлях нацыянальнай барацьбы, разьбіваючы такім чынам адзіны пролетарскі фронт, аслабляючы свайго ворага.

Тым часам барацьба за нацыянальнае вызваленьне не абапёртая на пунтк гледжаньня пролетарскага клясу, вядзецца бязмерна доўга і крывава (Ірляндыя) і дае сумныя вынікі для працоўных (Польшча). Мы бачым што пры істнаваньні т. з. Лігі Нацый, створанай для вызваленьне нацый, ідзе самае грубое небываласе прыгнячэньне цэлых нацый, як, прыкладам, Нямеччыну—ляжачую бьюць.

Сучасная Францыя зусім не зацікаўлена тым, што нямецкая прамысловасьць стала, што мільёны нямецкіх рабочых выкінуты на вуліцу без куска хлеба. Французкай буржуазіі патрэбны грошы для утрыманьня паслушнай ёй паліцыі і войска, для будовы марскога флота, каб трымаць у паслухмянасьці свае калёніі.

Прагавітасьць да нажывы і панаваньня асьляпіла Францыю ў адносінах да Нямеччыны. Нават Лёйд Джордж, у сваей прамове 10 чэрвеня, сказаў, што калі Францыя адкінець прапазыцыю даручыць разгледзіць справу нямецкіх даўгоў людзям кампэтэнтным, дык тады трудна верыць у будучыню цывілізацыі. Аглядаючы сучаснае становішча Л. Джордж прыходзе да чорных думак: ён адзначае ўсюды панаваньне гвалту. Па ягонаму палітыка гвалту стварыла дзьве Альзацыі ў Эўропе: Рура і Віленшчына. Праз нейкія малыя асабістыя карысьці кідаецца ў небясьпеку заваеваньні цывілізацыі. У роспачы пытае „стары леў“: куды ідзе чалавецтва?

Сапраўды становішча ў Заходняй-Эўропе робіцца з кожнай часінай больш грозным.

Паны дыплёматы, даўшы волю сваім імпэрыялістычным апэтытам, зашлі ў нерат. Што выгадна для аднаго з іх, тое не карысна для яго калегі з другой краіны і дзеля таго ніяк яны ня могуць згаварыцца, ні адна канфэрэнцыя ня кончылася з пажаданымі вынікамі. Кожнае нязначнае пытаньне ў палітычным жыцьці мала памалу разрастаецца ў важную справу, каля якой кожны з гэтых „дабрадзеяў“ хоча пажывіцца. Асабліва разгарэліся апэтыты у пераможцаў сусьветнай вайны каля акупацыі Руры. Акупацыя Руры панізіла вартасьць нямецкай маркі, стварыла цэлыя арміі безработных, увяла агульную эканамічную разруху. Гэта дало добры грунт для камуністычнай агітацыі, якая цяпер полымем пераносіцца па ўсей Нямеччыне. Ужо паліцыя ўраду Куно ня ў моцы ўтрымаць парадак, спакой і аўторытэтнасьць ураду. Нямеччына на пярэдадні ўзрыву рэвалюцыі, ад якой могуць загарэцца і суседнія краіны, дзе набралася ўжо ня мала палкага матэр'ялу.

Францыя ўжо пачынае чухацца ад вынікаў акупацыі Руры і пакрысе ідзе на ўступкі нямецкаму ураду. І вельмі магчыма што не ў далёкай будучыне ўсе фашысты згрыбелай Эўропы кінуцца „ратаваць“ цяпер паняверанную Нямеччыну, кінуцца гасіць пажар народнага гневу.

Каб ня было толькі позна. **Ю.**

Палітычныя падзеі.

Крызыс парлямэнтарызму.

Выпадкі апошніх гадоў у Эўропе ясна паказываюць, што парлямэнтарны лад перажывае свой крызыс. Аружныя пвравароты, як раз адбываюцца ў тых краёх, дзе парлямэнтарызм істнаваў ўжо ў працягу многіх гадоў і як раз з боку не рэвалюцыйных слаёў пралетарыяту, а з боку тэй самай буржуазіі, лібэральныя слаі якой так яскрава падкрэсьлівалі ідэальнасьць парлямэнцага ладу і былі яго тварцамі. Захват улады Мусоліні ў Італіі, фашыстоўскія загаворы ў Баварыі і Венгрыі, забурэньні ў Варшаве ў сьнежні мінулага году ў часе выбараў першага прэзыдэнта Польскай Рэспублікі зьяўляюцца характэрнымі праявамі часу. Усюды, дзе парламэнтарызм не задавальняе інтарэсаў буржуазіі і служыць перашкодаю ў яе імкненьнях да беззадноснай дыктатуры, яна не застаўляецца перад аружным пераваротам, перад зьнішчэньнем свае ўласнае канстытуцыі.

Падзеі апошніх дзён у Баўгарыі лішні раз падцьвярджаюць гэты факт. Урад Стамболійскага, які апіраўся на сялянскую партыю (штосьці на кшалт польскага „Пяста“) меў за сабою як у папярэднім, так і ў новым парлямэнце, вялізарную большасьць і, згодна з канстытуцыяй, быў самым парлямэнтарным і законным урадам.

Аднак гэта ня стрымала апазыцыю, 'да якой побач з сац.-дэм. належалі і рожныя буржуазныя партыі, скінуць гэты „зусім законны“ і парлямэнтарны ўрад шляхам аружнага перавароту.

Няпрыгоднасьць парлямэнтарнага рэжыму прызнае ня толькі рэвалюцыйны пралетарыят але... і сама буржуазія.

Польшча. Перагаворы паміж Польшчай і Гданскам у справе жалезнадарожнай дырэкцыі ў Гданску перарваны. Сытуацыя напружаная. Польскія газэты паведамляюць, што адносіны да палякаў у Гданску надта няпрыхільныя, у некаторых готэлях палякам адмаўляюць даваць пакоі. Апошнімі днямі ў Гданск прыехаў Радэк, савецкі пасол у Бэрліне, які адбыў шэраг канфэрэнцый з мясцовымі і загранічнымі камуністамі.

Згодна праекту дзяржаўнага бюджэту на бягучы год утрыманьне вастрогаў і арыштаваных абойдзецца ў 45 мільярдаў марак, а ўтрыманьне судоў больш за 62 мільярды.

Ваенным міністрам назначаны ген. Шэптыцкі.

Збунтавалшаяся люенасьць в. Гузэ, Кольненскага пав. у ліку 100 асоб самавольна выпасывала дзяржаўныя сенажаці. Паміж лясными старажамі і сялянамі дайшло да бойкі. На дапамогу старажам выслана была паліцыя, якая пачала страляць. Узброеныя сяляне напалі на паліцыю. Ранена двух сялян і некалькі паліцэйскіх. 13 чалавек арыштавана.

У Кракаве зноў падложана невядомымі асобамі бомба у памешканьне нейкага Гляса. Ахвяр у людзях ня было, матэрыяльная страты выносяць шмат мільёнаў марак.

Літва. У Коўні адбылося урачыстае адкрыцьце літоўскага Сойму. Старшынёю Сойму выбраны праф. Тумэнас (хр.-дэм), віцэ-старшынёй—Стаўдайтіс (народ. парт.). Склад новага Сойму, як паведамляе „Данцыгски Вѣстник“ гэткі: правы блок—40 паслоў, народныя сацыялісты—16 пас., сац. дэмакраты—8 пасл., нацыянальныя меншасьці . 14, ў тым ліку: палякаў—5, жыдоў—5, расейцаў—2, і немцаў—2.

Вітаючы новы Сойм Стульгіньскі адзначыў, што найважнейшым заданьнем новага Сойму будзе правядзеньне зямельнай рэформы і урэгуляваньне заграНічнай палітыкі. Пераходзячы да адносін з Польшчай прэзыдэнт сказаў: „Змушаны будзеце перадусім зачапіць нашую старую справу, акт, да якога Рада Амбасадораў далучала сваю карту; належачую да нас усходнюю правінцыю з нашай старою сталіцай Вільняй, груба ад нас забралі, далучаючы да Польшчы. Зразумела, што урад літоўскі прымушаны быў на гэта рэагаваць, складаючы востры пратэст“. У справе Клайпэды, выказаўшы задаваленьне з прычыны аб'яднаньня яе з Літвою, Стульгіньскі, зварочвае ўвагу на тыя цяжкія варункі, паніжаючыя сувэрэнныя правы літоўскага народу, якія ставіць Антанта і на якія Літва згадзіцца ня можа. Пасол Лайкунас зазначыў, што „Вільня яшчэ ня наша, але будзе наша“. („Głos Wilna“).

Камандуючым літоўскай арміі назначаны ген. Жулкоўскас.

Баўгарыя. Новы ўрад, які пасьля перавароту, абняў уладу складаецца з сац.-дэм. і бурж. парт. На чале ўраду стаіць праф. Чанкоў. Пераварот у Софіі адбыўся без праліцьця крыві. Па газэтным весткам Стамболійскі не арыштаваны, а ўцёк на правінцыю, дзе пры дапамозе сялян і сваіх староннікаў вядзе барацьбу з ўрадовымі войскамі.

Англія. Англа-савецкі канфлікт здаецца будзе ўладжаны мірна. Апошняя савецкая нота ў ангельскіх палітычных колах прынята з задаваленьнем. Ангельскі адказ на савецкую ноту будзе высланы на гэтым тыдні.

Ангельскі ўрад робіць захады, каб Антанта дала супольны адказ на апошню нямецкую ноту ў справе рэпарацый. Лорд Кэрзон падаў думку, каб Францыя і Англія зьвярнуліся да Лігі народаў з просьбай аб утварэньні камісіі рэчазнаўцаў, для абмякаваньня гэтых пытаньняў.

Нямеччына. Забастоўка ў нямецкай частцы Шлёнску абастраецца, прыймаючы разьмеры генаральнай. Забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых пашыраецца. Лік бастуючых даходзіць да 120.000.

У Бэрліне ўтворана таварыства прыяцеляў Сав. Расеі, у склад якога ўвайшло шмат відных палітыкаў, эканамістаў і літэратараў.

Украінскі кангрэс у Львове.

З мэтай аб'яднаньня ўсіх сілаў украінскіх партый у межах Польшчы склікаецца да Львова кангрэс украінскіх палітычных арганізацый з Холмшчыны, Палесься, Падляшша, Валыні і Ўсходняй Галічыны. Аб'еднаньне мае апірацца на супольнай дзейнасьці як у палітычных, так і ў эканамічных справах. За аб'еднаньнем высказаўся і зьезд ускраінскіх партыяў у Холме, які адбыўся 28 траўня. „Хліборобы“ з кс. Ільковым на чале, якія, як ведама, ведуць угадовую палітыку да сучаснага ўраду, удзелу ў зьезьдзе браць ня будуць.

Узбраеньне Францыі.

Марское міністэрства выпрацавала новую праграму будовы флоту на час 1925-30 г. г. У гэтым часе мае быць пабудована 85 вайсковых караблёў рознай велічыны. Да 1925 г. павінна быць пабудована 33— значыць усяго да 1930 г. флот Францыі павялічыцца на 118 караблёў. Як відаць, Францыя ня толькі Рурскі басэйн, але і ўсю Эўропу хоча прыціснуць акаваным кулаком.

Л. Джордж у С. С. С. Р.

„Sl. P.“ паведамляе, што сярод англійскіх урадовых кругаў ходзяць погаласкі, што Л. Джордж, пасьля вырашэньня англа-расейскага канфлікта, мае паехаць у С. С. С. Р. як карэспандэнт адной вялікай англійскай газэты.

С. С. С. Р.

26 чэрвеня г. г. ў Маскве адбудзецца новая сэсыя В.Ц.І.К-а, на якой аканчальна будзе вырашана пытаньне аб канстытуцыі Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Республік, у склад якога ўваходзіць 27 рэспублік і паасобных краін.

Дапамога палітычным занлючоным Захаду.

ГОМЕЛЬ, 13-4. За апошнія тры тыдні па Гомельскай губэрні сабрана на карысьць палітычных заключоных Заходняй Эўропы 80.000 рублёў.

Забойства ген. Яз. Булак-Балаховіча.

„Kurjer Poranny“ паведамляе, што ў Белавескай пушчы забіты ген. Язэп Булак-Балаховіч, брат вядомага „бацькі“ ген. Станіслава Б.-Балаховіча. Забойства, быццам мае палітычныя матывы. Па весткам таго-ж „Kur. Por.“ аднача сна быў арганізованы напад і на самога „бацьку“. Сярод балахоўцаў і савінкаўцаў ходзяць чуткі, што прычынай забойства былі, якіясьці грошы, атрыманыя ад нейкай манархічнай арганізацыі і якія ня былі ужыты на празначаныя мэты.

З газэт.

Галасы аднадумцаў і прыкры дысананс.

Эндэцкая газэта „Gazeta Warszawska“ трыумфуе: француская правая прэсса ў адзін голас горача вітае паварот у Польшчы ў бок рэакцыі і нацыяналізму. „Echo National“, „Eclair“, „Victoire“ згодным хорам увасхваляюць пабеду „нацыянальнае большасьці“ ў Сойме. „Libre Parole“, ягадка з таго-ж поля, паміж іншым гэтак гаворыць аб дэклярацыі новага ўраду:

„У дэклярацыі п. Вітаса ёсьць вельмі характэрнае месца, ў якім гаворыцца аб зьмене адносін Англіі да Польшчы, Гэта — факт. Захват у Лёндане ўлады консэрватыстамі разьвеяў атмасфэру недаверыя, якую адносна да Польшчы тварыў п. Лёйд Джордж. Лёрд Каван паехаў у Варшаву сьледам за Маршалкам Фошам. Англійскі рынак можа адыграць вялікую ролю ў аздараўленьні польскіх фінансаў. Вось чым тлумачацца прыемныя словы п. Вітаса. Ня маем прычыны хмурыцца на іх. Новы польскі ўрад ведае, якая шчыльная салідарнасьць злучае Польшчу з Францыяй. Зусім пэўна, што ўрад п. Вітаса ніколі не забудзецца, што становіць бар'ер процi пан-германізму і бальшавізму.

Гэтае напамінаньне аб падсобнай ролі Польшчы і ласкавае пазваленьне ёй таргавацць з Англіяй неяк дзіўна выглядаюць у вустах „прыяцеляў“... А яшчэ дзіўней выдаецца пэўнасьць адносна да зьмены паглядаў Англіі на Польшчы, калі прачытаем у тым-жа нумэры „Gaz. Warsz.“ заметку пад назовам „Фальшывы прарок“. У гэтай заметцы прыводзяцца словы Лёйд Джорджа, сказаныя ў мінулую нядзелю на мітынгу ў касьцеле і пасьля перад касьцёлам:

„Трэба канечна палажыць канец панаваньню на ўсенькім сьвеце гвалту; гэтае панаваньне гвалту за апошнія гады стварыла ў Эўропе новыя Эльзасы і Лятарынгіі, а іменна: Польшча заняцьцем Вільні, а Францыя—захватам Рурскае абласьці даказалі, што дзеля мінаючых мэт уласнае карысьці яны гатовы ахвяраваць будучыну цывілізацыі“.

А амэрыканскі доляр ужо перайшоў за 95.000 польскіх марак.... Відаць, спогад французкіх нацыяналістаў і англійскіх консэрватараў мае для польскай маркі менш вагі, чым словы „фальшывага прарока“.

З Польскага Сойму.

Недаўна абгаварываўся у соймавай скарбовай камісіі праект зямельнага падатку. Гэты падатак мусіў быць прогрэсіўны, гэта значыць, што хто больш мае грунту той мусіць аплаціць больш грошы. Найбольшы множнік для паноў—абшарнікаў мусіў быць 200 працэнтный. Але паны стварыўшы большасьць пануюць і замест 200 зрабілі 120 працэнтаў. А гэта-ж яшчэ толькі красачкі, а ягадкі яшчэ будуць.

Справа амнастыі, якую апрацаваў і падаў у Сойм яшчэ ўрад Сікорскага, як вядома разглядалася у юрыдычнай камісіі, а пасьля ў субкамісыі ды ізноў камісія, якая адлажыла, справу амнастыі аж пакуль ня „выясьніцца“ сытуацыя у Сойме. Цяпер ужо ўсё „выясьнілася“ і праэкт амнастыі ізноў разгледаецца камісіяй...

У якой аканчальнай рэдакцыі выйдзе амнастыя трудна ўгадаць, адно можна спадзявацца, што яна паходзіць яшчэ праз камісію, субкамісію ў Сойм і ізноў з пачатку, бо справа амнастыі пасьля „выясьненьня“ стала як відаць, ня „сьпешнай“ і ня „слушнай“.

Абрады Сойму над бюджэтам на другі квартал на бяг. год мелі вельмі бурны характэр. Левыя паслы ў сваіх прамовах рэзка нападалі на цяперашні ўрад і ягоную палітыку, на саюз паміж Пястамі і Хьенай, як здраду інтарэсаў малазямельнага сялянства і што галоўнымі пунктамі эндэцкай палітыкі ёсьць зьнясеньня 8 гадз. дня працы, абароны кватэрантаў і праве забастовак. Пас. Медзінскі (група Донбскага) падкрэсьліў ненармальныя стасункі ў арміі, якія стварыліся пасьля адстаўкі Пілсудскага і той гвалт які стасуецца да апазыцыйн. прасы, Цікава адзнач. што левіца паслугоўваецца тым самым аружжам, якім паслугоўвалася правіца процiў яе. Так п. Чапінскі (P.P.S.) нападаў на эндэцыю за тое, што яна прыхільна адносіцца да жыдоў, на што атрымаў рэзкі адказ ад Грунбаума.

Сойм аднагалосна прыняў сьпешнасьць прапазыцыі Беларускага Пасольскага Клюбу ў справе пагвалчэньня Канстытуцыі Польскай Рэспублікі праз бясправнае арыштаваньне пасла Барана. Прапазыцыя адаслана да камісіі.

Камісія Рэгуляміновая пастанавіла выдаць суду пасла Баранава. Процiў выданьня галасавалі нацыянальныя меншасьці і левіца.

„Працэнтная норма“ ў прасьветнай Камісіі.

У прасьветнай камісіі Сойму абгаварвалася справа абмяжаваньня лічбы студэнтаў нацыянальнасьцяў жыдоўскай, украінскай, беларускай і нямецкай у польскіх унівэрсытэтах. Справа гэтая паднята польскай правіцай і цягнецца ўжо подаўна. Ходзіць польскай правіцы аб тое, каб завесьці ў польскіх унівэрсытэтах „працэнтную норму“ для усіх студэнтаў, паходзячых з нацыянальных меньшасьцяў, больш-меньш у такім відзе, як гэта было ў адносінах да жыдоў у царскай Расеі. У польскіх правых кругох спачатку і ішла справа толькі аб абмежаваньні правоў жыдоў, але ў далейшай працы камісіі гэтая справа абмежаваньня правоў была расьцягнута і на другія меньшасьці. Прапазыцыя аб гэтым ў камісіі была пададзена дэпутатам Кернікам (вітасовец-пястовец), які цяпер стаўся міністрам унутраных спраў ў Урадзе Вітаса.

Паскольку, згодна канстытуцыі, усе грамадзяне Польскай Рэспублікі маюць права карыстацца роўнымі правамі, дык дзіўным выдаецца, як магла паўстаць самая думка аб урэзаньні ў прасьвеце правоў для нацыянальных меньшасьцяў, якія складаюць трэцюю частку ўсяго насяленьня Польшчы. Гэта тлумачыцца тым, што Хіена (№ 8 на выбарах) злучылась цяпер з Вітасоўцамі (№ 1 на выбарах), стварылі польскую правіцовую большасьць і дзеля гэтага сьмялей яшчэ цяпер ставяць гэткія дражлівыя пытаньні.

Ня гледзячы на дамаганьні дэпутата Тона перанесьці гэтае пытаньне ў камісію конституцыйную з мэтай устанаўленыя, ці згаджаецца гэтае пытаньне з асновамі конституцыі,—правіцовая большасьць ў камісіі адкінула гэтую прапазыцыю.

І толькі дзякуючы таму, што цяперашні міністар асьветы эндэк Гламбінскі ня мог выказаць поглядаў на гэтую справу ўсяго Ураду, а гаварыў толькі ад сябе, выпадкова утварылась большасьць камісіі, якая пастанавіла адлажыць разгляд усяе справы да паведамленьня аб поглядах Ураду,—г. зн. удалося адцягнуцьзасноўваючыся на фармальнай прычыне.

„10 галоўных грахоў Хьена-Вітасоўскага ўраду“.

У часе дыскусыі над бюджэтам у Сойме пас. Чапінскі так ахарактэрызаваў новы ўрад:

„Урад, які ў заграні чнай палітыцы ня мае павагі, ўрад, які не бароніць інтарэсаў дзяржавы, урад, які вядзе палітыку авантур, урад, які ёсьць здрадай зямельнай рэформы, урад, які ў справах сацыяльных ёсьць урадам рэакцыі, кіраванай праз уладаючыя клясы, урад, які ў культурных справах знаходзіцца пад пантофлям біскупаў, ўрад, які сее палітыку разлажэньня ў арміі, ўрад, які вядзе экстэрмінацыйную палітыку, ўрад, які аб'ектыўна прыгатаваны, каб зваліць дэмакратыю ў Польшчы, гэты ўрад ёсьць ня толькі ворагам працоўных клясаў, але перадусім шкодны для ўсей Польшчы“.

Паход процiу паслоу.

Рэзультаты выбараў у Сойм, даўшыя беларусам адзінаццаць дэпутацкіх месцаў не спадабаліся рэакцыйнам польскім кругам. Не маючы магчымасьці зьмяніць дакананы на выбарах факт, польскія рэакцыяне-

ры прыдумалі вельмі хітры спосаб абязьсіленьня беларускага прадстаўніцтва у Сойме. І вось, вытачываюцца судовыя працэсы проціў паслоў Якавюка і Баранава. Баранава суд прыгаварвае на 6 гадоў цяжкай адсідкі ў вастрозе, хоць, як выясьнілася на працэсе, дык Баранаў у нічым не вінават. Прыгавор над Баранавым яшчэ ня мае сілы, бо справа пойдзе ў апэляцыйную інстанцыю, і Баранаў ёсьць яшчэ паўнапраўным паслом. Сойм яшчэ не разьбіраў справы аб выдачы Баранава, аднак яго арыштоўваюць у Горадні, куды ён прыехаў да бацькоў. Чым скончыцца гэты надзвычайны паход проціў Баранава,—няведама, але можна думаць, што правіцовы ўрад зробіць усё, каб Баранава засадзіць у вастрог.

Гэтымі днямі паступіла ў Сойм запатрэбаваньне Віленскай пракуратуры аб выдачы пад суд другога беларускага пасла гр. А. Аўсяніка, які абвінавачываецца у „zdradzie stanu“, г. ё. у тым, што быў у Ковенской Літве і быццам там вёў антыпольскую працу. Справа гэта вывалачана на сьвет цяпер толькі, калі беларусы сказалі сваё слова у Сойме. А да таго справа гэтая была забытаю і ніхто яе і ня думаў парушаць, так як пабыт гр. Аўсяніка у Коўне адносіцца да часоў так званай „Сярэдняй Літвы“, паасобнай ад Польшчы дзяржавы.

Ходзяць чуткі, што зьбіраюцца матэр'ялы і падгатоўваецца абвінавачаньне і проціў пасла Б. Тарашкевіча. А там далей, як чуваць, хочуць забрацца і да другіх паслоў. Адным словам, паход распачаўся і ў рэзультаце можа стацца, што рэдка хто з цяпэрашніх паслоў астанецца ў Сойме, бо сэнатар Багдановіч і пасол Каліноўскі, як заквэсьціянаваныя, будуць, відаць, пазбаўлены мандатаў. Баранаў ужо ў вастрозе. Аўсяніка так сама ўжо цягнуць пад суд. Тарашкевіча гатуюцца прыцягнуць. Паслам Раку-Міхайлоўскаму і Кахановічу не выдаюць пашпартоў, адмаўляючы ім у прызнаньні абыватэльства.

Адным словам, робіцца ўсё, каб скасаваць непажаданыя ім вынікі выбароў. А ў Наваградзкім акрузе хочуць зусім адмяніць выбары.

Коштам „акраін“....

Умова паміж правымі партыямі сойму і партыяй „Пяст“, на аснове якое утварыўся ўрад пана Вітаса, мае, паміж іншым, пункт і аб зямельнай рэформе.

Зямельная рэформа, прынятая устаноўчым соймам, аснована на тым, што ўрад мае вясьці прымусовы выкуп дворнае зямлі звыш вядомае нормы і распрадаваць сялянам. Хаця такая рэформа ня можа здаволіць патрэб бяднейшага сялянства, польскія абшарнікі і ў ёй дагледзілі нарушэньне „сьвятога права прыватнае ўласнасьці“ і павялі вострую барацьбу з ёй. І вось ажно па сягоньняшні дзень яны спыняюць правядзеньне зямельнае рэформы ў жыцьцё.

Калі-б у гэтым былі зацікаўлены толькі паны-абшарнікі, дык ім, пэўне-ж, ня так лёгка было-бы стаўляць перашкоды зямельнай рэформе. Але яны знайшлі сабе хаўрусьнікаў сярод польскіх нацыяналістаў: апошнія сур'ёзна ўзбаяліся, што на беларускіх і украінскіх землях дворныя абшары польскіх паноў будуць падзелены між беларускімі і украінскімі сялянамі, якія ад гэтага вельмі ўзмацуюцца, а польскі „stan posiadania“ вельмі паменшыцца.

Аднак, адна „правіца“ ня мела такое сілы, каб і ў цяперашнім сойме вясьці барацьбу з зямельнай рэформай на сваю руку. Вось, правыя і нацыяналісты і пайшлі ў хаўрус з партыяй „пястоўцаў“, аддаўшы галаве гэнае партыі, пану Вітасу, прэм'ерства — ведама, за сур'ёзныя „компэнсацыі“.

Хаця умова паміж правымі і „пястоўцамі“ трымаецца ў сакрэце, некаторыя пункты яе дайшлі да ведама грамадзянства. Да такіх пунктаў палежыць і пункт умовы аб зямлі.

Як нам паказывае з Варшавы наш карэспандэнт, у справе зямельнае рэформы ўмовіліся гэтак: кожны год на парцэляцыю мае ісьці ня больш за 400.000 маргоў дворнае зямлі. Дый з гэтае лічбы 60% мае прыпадаць на „акраіны“ („kresy“),—аднак, з тэй агаворкай, што ў першы чарод будуць надзяляцца польскія „асаднікі“, для якіх сойм ужо асыгнаваў 50 міліярдаў марак. Для беларускіх і украінскіх сялян пойдзе тое, што астанецца ад „асаднікаў“. Такім парадкам, хоць і паменшыцца ўладаньне польскіх паноў, ды польскі „stan posiadania“ на „акраінах“ ня зьменшыцца: зямля ўсё роўна астанецца ў польскіх руках! У самай-жа этнаграфічнай Польшчы на парцэляцыю пойдзе толькі 40% ад гэных 400,000 маргоў (значыць, 160,000 марг.)—а гэта з тэй мэтай, каб польскіх сялян прымусіць перасяляцца на беларускія і украінскія землі.

Ведама, нашы „крэсовыя“ абшарнікі ўзбураны такім праектам: яны разам пачулі, што пакрыўджанымі акажуцца ня толькі нашы сяляні, але і яны самі, абшарнікі-ж у этнаграфічнай Польшчы будуць забясьпечаны ад пазбаўленьня зямлі коштам „крэсоўцаў“.

Зусім зразумела, што ніхто сабе ня вораг. Дык і нашы абшарнікі адмаўляюцца ад далейшага супрацоўніцтва з права-пястоўскім блёкам, які парушыў іхныя інтарэсы. Вялікі абшарнік з Украіны, сэнатар Стэцкі, ужо выступіў з блёку. Можна спадзявацца, што за ім пойдуць і другія: свая кашуля бліжэй, чым кашуля пана Вітаса!

З гэтага бачым што так наз. „większość polska“ пачынае па крыху разваліваццэ.

Лаўрыновіч.

Нацыянальнае пытаньне на Усходзе.

Газэта „Савецкая Беларусь“ у сваей перадавіцы пад загалоўкам „Наша нацыянальная палітыка“ піша:

„Лёзунг аб правох нацыянальнасьцяў на свабонае самавызначэньне аж да адлучэньня і стварэньня самастойнага дзяржаўнага арганізму быў апавешчан з першых дзён Акцябрскай Рэвалюцыі.

Прыгнеценыя расейскім самадзяржаўем народы лічуць вінавайцам зьдзекаў ня толькі самадзяржаўную, бюракратыю, але і вялікарасейскую нацыю ў цэлым.

Савецкая ўлада ўсялякімі спосабамі даказывае што пралетарыят нішчыць усе крыўды, нанесенныя ранейшымі рэжымамі нацыянальнасьцям Расеі.

І вось гэтай нашай нацыянальнай палітыкай мы заваявалі сымпацыю ўсіх працоўных мас народаў, якія ўваходзілі раней у склад царскай Расеі. Гэтым у значнай меры і тлумачыцца наша перамога над нашымі ворагамі, якія арудавалі на акраінах.

Прыгнеценыя раней народнасьці за гады істнаваньня Савецкай улады атрымалі магчымасьць самаўпраўляцца і стварыць свае ўласныя нацыянальныя і культурныя ўстановы. Але гэтым справа не канчаецца.

У нашай праграме і канстытуцыі мы кажам, што свабодамі цалком можна пралетарыяту карыстацца тады калі ён, мае дзеля гэтага матар'яльныя магчымасьці.

Гэта адносіцца таксама к свабодзе самавызначэньня нацыянальнасьцяў. Царская ўлада пастаянна грабіла пад'ярэмныя нацыянальнасьці, не давала ім магчымасьці эканамічна і культурна разьвівацца. Усюды панаваў расейскі фабрыкант, купец і банкір.

На акраінах фабрыкі і заводы наўмысьля не будаваліся. Дзеля гэтага цяпер так бедны нашыя акраінныя Сав. Рэспублікі індустрыяльным пралетарыятам. Дзеля гэтага так цяжка будаваць там асновы Савецкай улады.

Падняць прамысловасьць і культурнасьць прыгнеценых царызмам нацыянальнасьцяў — найважнейшая наша задача. Саюз рабочых і сялян падыйме ўровень прамысловасьці і культурнасьці быўшых заняволеных народаў у Расеі.

Вось на гэтым будуецца наша нацыянальная палітыка.

Астаецца толькі пажадаць каб гэтыя словы шырэй і хутчэй праводзіліся ў жыцьцё.

Гмінная гаспадарка.

Віленская польская газэта „Slowo“ ў апошніх нумэрох прыадкрыла завесу над гаспадаркай так-званых „гмінных самаўрадаў“ у Заходняй Беларусі. Газэта падала бюджэты 14-ёх гмін: Даўгінаўскай, Гарадоцкай, Крывіцкай, Маладэчынскай, Вязынскай, Краснасельскай, Лебедзеўскай, Куранецкай, Вялейскай, Касьцяневіцкай, Хаценчыцкай, Рэчкаўскай, Ільскай, Алькавіцкай, Іжанскай і Радашкоўскай. З іх, як на далоні, відаць, па якой дарозе вядзе нашы самаўрады тутэйшая адміністрацыя.

Кожнаму ясна, што істнаваньне гмінных самаўрадаў мае на мэце не „пісаньне папераў“, а кіраваньне ўсей гаспадаркай гміны і ужываньне гмінных грошы на карысныя для ўсяго жыхарства гміны справы. Ясна такжа, што ўжываньне грамадзкіх грошы на тое, ад чаго нямашака карысьці для гміны, зьяўляецца нерацыянальным, несправядлівым і нават шкодным, бо падрывае ў народзе веру ў карыснасьць і патрэбу самога гміннага самаўраду. Як-жа з гэтага пагляду выглядае гаспадарка пералічаных 14-ёх гмін, падлягаючых кіраўніцтву віленскае дэлегатуры?

Аказываецца, што з агульнае сумы 633.365.000 марак, вытрачаных гэнымі гмінамі за першую палову гэтага году, **больш, як палова, пайшло на утрыманьне гміннае адміністрацыі**, бо ажно 58%, пад той час, як на карысныя справы: школы, лекарскую помач, дарогі і др., вытрачана ўсяго 42%. Толькі ў трох гмінах на адміністрацыю пайшло менш паловы ўсяго бюджэту: ў Хаценчыцкай — 37%, у Даўгінаўскай — 39% і ў Алькавіцкай 46%. Затое ў Радашкоўскай гміне адміністрацыя зьела ажно 72% (значыцца, блізу тры чвэрці!), пакінуўшы на карысныя выдаткі ўсяго 28% бюджэту; у Ільскай зьела яна — 70%, у Маладэчанскай — 68% і г. д. Адным словам, каб завясьці сабе розных карысных рэчы на 266,013.300 марак, насяленьне сказаных 14-ёх гмін прымушана было заплаціць гміннай адміністрацыі 367.351.700 марак!

Наскольки падобная гаспадарка зьяўляецца рацыяльнай, няхай падумае і адкажа віленская дэлегатура: яна-ж праз своіх „рэфэрэнтаў самаўраду“ кіруе укладаньнем бюджэтаў, устанаўленьнем лічбы платных ураднікаў у гмінах і т. п. Можа гэная маса людзей, якія сядзяць і штосьці пішуць у гміне, патрэбна для ўраду, — дык няхай-бы ўрад узяў на сябе і утрыманьне іх. Для насяленьня-ж гмін іх бязумоўна зашмат: аб гэтым зусім пераконываюць тыя цыфры, якія мы тут падалі

Цікава адзначыць, што ў валасьцёх з найменшай лічбай жыхароў (Радашкоўскай, Іжанскай, Ільскай) на адміністрацыю ідзе найвялікшы процэнт усіх выдаткаў (72—,60%). Гэта — лішні доказ таго, як нерацыянальна пастаўлена справа устаноўленьня штатаў служачых у гмінных самаўрадах. Вынік гэтага той, што ў найменшых гмінах на кожную душу (лічучы і дзяцей) выпадае за паўгоду ў круглых лічбах 7.000 марак, а на сям'ю ў сярэднім з пяцёх душ — 35.000 марак, пад той час, як у вялікшых валасьцёх — роўна ўдвая менш.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што польская адміністрацыя не клапоціцца аб „крэсах“ як аб нечым сваім родным, а гаспадарыць на іх, як на чужым, бо нават такая простая рэч, як рацыяльная перакройка гмінных межаў, не заслуговывае іх увагі, а што-ж казаць аб будове краю, прасьвеце і т. п.

Ст. Мірскі.

Два волаты.

Як прыглядзішся да сучаснасьці, дык выразна бачыш два станы людзей. Адны працуюць з малку да сьмерці ці калецтва, а другія карыстаюць з гэтай працы, палец а палец не ўдарыўшы, каб памагчы змучаным братам.

Селянін ад зары да зары набівае мазалі, напружае сваю сілу, каб пракарміць сябе і сямью з вузенькага шнурка свайго грунту. Вечна ён бедны. І худоба, і дамова яго мізэрная убогая, дзеткі абарваныя, нявучоныя, брудныя ня знаюць за працай і хатнімі бедамі хараства жыцьця, радасьцей дзяцінства. А прыйдзе старасіць, дык селянін са страхам прыглядаецца да сваей немачнасьці, бо ня ведае ці зможа хто з дзяцей па сваей беднаце пракарміць яго. Так ён і сходзе ў магілу галодны душой і целам.

І чаму-ж гэта так? Няўжо зямля такая бедная, што ня можа даць сытага жыцьця, колькі на ёй не працуй, як яе не зьлівай потам. Не. Зямля-маці кажуць сяляне, зямля добра аплачывае працу. Селянін за сваю працу столькі мае, што корміць чыноўнікаў, войска, духавенства, абшарнікаў, купцоў, а найменш астаўляе сабе і гэта не па дабраце сваей, не па баязьні, а проста дзеля таго, што ён ня чуе сваей моцы, свайго вялікага назначэньня ў гэтым яго гора, яго занепад. Ен волат працы і можа падзяліць гэту працу як сам хоча і з кім хоча.

У горадзе селянін можа раздабыць усё, што патрэбна яму да жыцьця і чаго не даець зямля, Гэта „усё“ прадаець купец і стараецца, каб як можна больш зьдзёрці, спрытней ашукаць. Дужа ён даражыць гэтае „ўсё“, быццам сам яго робіць, каб часам ня быць у страце, каб аплаціць сваю працу. Так яно з боку выглядае, а тым часам працы купец ніякай не кладзець, бо ў яго і фабрыкантаў працуець цэлая армія рабочых, якія запрогшыся ў машыны ў духаце, у цемнаце так сама працуюць з малку да сьмерці і з сваей працы бяруць толькі тое, каб напаўгалодна пражыць, а рэшта ідзе тым, хто непрацуе, а жывець з яго працы як і з сялянскай. Вось гэта другі волат працы.

Зразумела, што калі такія два волаты пададуць адзін другому рукі і парашаць ня быць больш рабамі, а сваё запрацованае даваць туды, куды яны захочуць—і ніхто ім не запярэча, бо яны волаты, дык усё хто з іх працы жыў устрывожыцца, прадбачыўшы голад і стане працаваць. А раз усе будуць працаваць, дык і жыцьцё будзе як жыцьцё, а ня крама і ня пекла.

Р. Юргілевіч.

Праява часу.

Ужо ня раз даводзілася нам чуць аб выступлень-нях у Навагрудчыне неякага Мухі, які карыстаецца папулярнасьцяй сярод мясцовага сялянскага люду. Муха нападае на панскія двары, на купцоў, на дзяржаўныя ўстановы, банкі і адабраўшы грошы без забойстваў і дзікіх выступленьняў зьнікае няма ведаму куды як няма ведама адкуль і зьявіўся. Пры гэтым Муха заўсёгды дужа добра паведамлены калі і якія грошы маюць атрымаць яго ахвяры. Адбіраючы грошы ён мае манеру нэкульку пакінуць іх уласьніку на „першыя патрэбы“. На адабраныя грошы часта робіць запамогі бяднейшаму жыхарству, дзякуючы чаму карыстаецца прыхільнасьцяй сярод сялянства і гэта робіць яго неўлавімым. Ня было выпадка, каб ён калі закрыўдзіў якогась бедака.

Аб Мусе ў Навагрудчыне ходзяць самыя небывалыя і дзіўныя лягенды—ён робіцца неякім героям, чалавекам уладаючым „нячыстай моцай“; яго і баяцца і захопліваюцца надзвычайнымі чынамі.

Былі выпадкі калі Муха ўласнаручна пісаў да якога-колечы пастарунка паліцыі паведамленьне, што а такой гадзіне будзе ў мястэчку і каб яго чакалі, І праўда ўся паліцыя і тайная і яўная нарыхтавалася. усё была зроблена каб апазнаць Муху, акружыць і злавіць. Чакаюць—і раптам чуюць што быў у рэстаране забраў у нейкага пана грошы і махнуў не спазнаны. „Gazeta Poranna“ дае апаведаньне з апошніх выступленьняў гэтага Мухі. У вёсцы Дзеніскавічы, Кругавіцкай гміны ёсьць лясная фірма, куды Муха зьбіраўся прыйсьці ў „госьці“ і назначыў нават дзень аб гэтым ужо ўсе ведалі. І паліцыя таксама прырыхтавалася. Але Муха перахітрыў усіх і нечаканы наскачыў у гэты дзень на мястэчка Чучэвічы з 40 чапа-

век коньніцы. Прыйшоўшы на пастарунак паліцыя разаружылі 4 паліцэйскіх, зьвязалі і палажылі іх тварам да зямлі загадаўшы ім ані пікнуць. Адтуль пашлі да аднаго жыдоўскага купца, які таргуе мясам, каб забраць у яго 40.000.000 м., якія купец меў атрымаць у гэты дзень. Але на гэты раз Муха абмыліўся, бо грошы чамусьці не прышлі, запозьніліся. Ад купца Муха пашоў у гміну дзе забраў 14 мільёнаў марак і загадаў сваім людзям пакарацъ войта і пісара за іх дрэнныя адносіны да сялян і зазначыў ім, што калі яны ня зьменяць сваіх дрэнных прывычак, дык ён сам з' імі расправіцца—зробіць „райскае вясельле". Апрач таго на поште забралі 300.000 марак, а склад гарэлкі падзялілі паміж жыхарамі мястэчка. Такім парадкам прабыўшы ў мястэчку 4 гадзіны Муха на чале свайго атраду выехаў з мястэчка ў напрамку вёскі Чудзін.

„Gazeta Poranna" адзначае, што да жыхароў уся кампанія Мухі адносілась дужа ветліва і калі хто меў што зрабіць, дык мусіў мець дазвол ад самога Мухі.

Паведамляюць, што, затрымаўшыся ў лясьніка ўвесь атрад Мухі ўсю ноч банкетаваў і толькі ўжо добрым днём іх ня стала.

Падобных „герояў" давала эпоха панаваньня расейскай царыцы Кацярыны, пры якой паншчына перажывала свой росквіт. Найвыдатнейшым атаманам быў у той час вядомы Пугачоў.

Ж.

З усяе Беларусі.

Пружанскі павет.

Для ведама нашых пасьлоў і для перасьцярогі і навукі нашым сярмяжнікам апішу як у нас адбываюцца „выбары". Выбары ў нас ня ёсьць выкананьне найсьвяцейшага права народу: выяўленьне сваей волі, а проста камэдыя, ў якой рэжысэрую мясцовы пан-абшарнік.

Усім ужо ведама, што ў гмінныя рады палалі альбо месцовая шляхта і ксяндзы, альбо неякія панскія паліхачы; рэдка дзе гмінная рада складаецца з выбраннікаў народу, але такія гміны знаходзяцца ў нялаcцы староства... але аб гэтым другім разам.

Здавалася-б, што хоць гэтыя і фальшывыя гмінныя рады аднак яны павінна былі-б выбіраць павётовы соймік, але у нас вышла інакш. Так неяк скомкалі, скруцілі гэтыя выбары і не агледзіліся мы як ужо соймік гатоў. І вось у сойміку загаспадарыў наш староста. Перад агульным паседжаньні старосты склікаў усіх яму пажаданых на паседжаньне, дзе і парашылі каго ў якую камісію выбраць. 19 красавіка ў дзень адкрыцьця сойміку староста, перш чым прыступіць да выбараў у камісіі, запрасіў усіх дэпутатаў на абед, на якім гаспадар павету добра ўгасьціў гарэлкай і прынукай сваіх „chłopków". Далей ужо нечага пісаць, бо кожнаму ясна, што усё „пашло як па масьле".

Ш.

Веска Раубіцы, (Бельшчына).

У нашай вёсцы ўжо два гады як істнуе польская школа, але на што і для каго яна закладзена, дык ніхто з нас не дагадаецца. Дзеці пробавалі запісывацца і хадзіць у школу дык вучыцель ня хоча каза, што усё роўна з хамскіх дзяцей нічога ня будзе, нічому не навучыш і сам ваймаецца гандлярствам коней. Вось і навука. Ратуючы дзяцей прасілі адчыніць беларускую школу, але чамусьце не даюць дазволу. Страшна робіцца за будучыну.

Селянін.

Бяларуцкая вол., Менск. пав.

З зімы жыта выглядала зусім дрэнна, але цяпер крыху папраўляецца, хоць і шкодзяць дажджы. У некатарых мясцох жыта вымакла, але можна будзе чакаць ня меншага ўраджаю, як і летась.

Большая частка сялянства ўжо адсадзіла скарапспелку і бярэцца за прыгатаўленьне поля да засеву збожжа. У значнай часткі сялян ня хопіць свайго насеньня.

Сады як у сялян, так і ў сав. гаспадарках аб'гледжаны як мае быць: яблані паабкапаваны, сучкі сухія паабрэзаны, паабскрэбана кара, дрэвы пабелены.

Чарвей у нашай валасьці не прыкмячалася кучамі, а дзе ня дзе быў адзін ці два, дык і тыя прапалі.

Ул.

Азімыя пасевы—сярэднія.

(Пунаускае вол., Слуцк пав.).

У нашай валасьці азімыя пасевы з пад сьнегу вышлі добрыя. Але як пачаліся халады крышку пагоршалі. Наогул, становішча азімых пасеваў цяпер сярэдняе.

Пасеў ярыны затрымоўваюць дажджы; сяляне-ж рвуцца да раньняга пасеву. Сухмень астатніх гадоў навучыў сеяць рана.

Земляроб.

Камісія беларусазнаўства у Случчыне.

Камісія беларусазнаўства пры Слуцкім Аддзеле Народнае Асьветы ўсё шырэй разьвівае сваю працу, абхопліваючы ўсё новыя галіны народнае асьветы.

Камісія была зложана ў сьнежні леташняга году сходам настаўнікаў беларусазнаўства.

Камісія паставіла сябе мэтаю—больш глыбокую падрыхтоўку саміх выкладчыкаў прадмётаў беларусазнаўства з боку пэдагогікі, мэтодыкі і радзімазнаўства, а таксама ўсебаковае ізучэньне краю, асабліва Слуцкага павету. Для выкананьня гэтых мэтаў камісія наладжвае цэлы шэраг літэратурных і навуковых лекцыяў і дакладаў, Арганізавана лектарскае бюро і наладжваецца шэраг гуртоў самаасьветы і каротка-тэрміновыя курсы. На апошнім пасяджэньні камісіі былі выстаўлены гэткія даклады: „Аб беларускай аповесьці і рамане" (Гарэцкага і Гартнага;), і „рэвалюцыйнага руху і гісторыі народнае асьветы на Беларусі", для чаго камісіяй назначаны адпаведныя дакладчыкі.

Камісіяй распрацаваны і праводзіцца ў жыцьцё шырокі плян экскурсіяў вучняў школ гораду і павету. Мэта экскурсіяў—шырокія прыродазнаўчыя і гістарычныя досьледы краю.

Для паглыбленьня ведаў беларускай мовы і прадмэтаў беларусазнаўства паміж пэрсаналам дашкольных установаў камісія наладзіла кароткатэрміновыя курсы. Выкладаньне дысцыплін на курсах узялі на сябе члены камісіі.

Баявым заданьнем камісіі зьяўляецца арганізацыя ў Слуцку музэю краязнаўства. Музэй павінен мець аддзелы: пэдагагічны, этнаграфічны, географічны і прамысловы з пад'аддзеламі сельска-гаспадарчым, тэхнічным і кустарна-мастацкім.

З Беларускага Жыцьця.

Чаму? Чаму Магістрат горада Вільні налажыў налогу на Віленскае Беларускае Сабраньне 64000 поль. злот. а на Польскі Шляхоцкі Клюб 60.000 п. з.? Напрашываецца гэткі адказ: груган гругану ня выдзяўбець вока.

Рэдактар Я. Лагіновіч пацягнуты да адказнасьці па 129 і 154 арт. К. К. за некаторыя артыкулы надрукаваныя у № 1 „Новага Жыцьця", зачыняный ужо газэце якую Я. Лагіновіч перш радагаваў, № 1 вышаў 3-га сакавіка і ня быў сканфіскаваны.

З выдатнейшых беларускіх літэрацкіх сіл ў Вільні стварылася ініцыятыўная група, паставіўшая сабе на мэце выданьне беларускага журнала квартальніка.

Беларусы у Амэрыцы.

Чыкагская газэта „Свободная Россия" ад 26-га траўня пад загалоўкам „Беларускае жыцьцё" зьмяшчае гэткія весткі з жыцьця беларусаў у Чыкаго.

Зьезд Беларускай эміграцыі у Амэрыцы.

Беларускі Чыкагскі Камітэт пачаў энэргічную дзейнасьць аб скліканьні першага зьезду беларускай эміграцыі на восень гэтага году ў Чыкаго. Бліжэйшыя паседжаньні камітэту вызначаць дзень зьезду.

Другая лекцыя Антона Змагара аб Беларусі.

У суботу 2-га чэрвеня А. Змагар прачытае другую лекцыю аб барацьбе беларускага народу за волю і зямлю ў памешканьні Саут-Сайдскай школы. Лекцыя гэтая ладзіцца па просьбе самых грамадзян, якія зьвярнуліся ў Беларускі камітэт з просьбай наладзіць лекцыю аб Беларусі.

Приезд у Амэрыку новых беларускіх дзеячоў.

Саюз Беларускіх Стральцоў пастанавіў на сваім апошнім паседжаньні дэлегаваць у Амэрыку двух сваіх прадстаўнікоў. Далегаты маюць намер быць праездам і ў Чыкаго.

З Менску.

Усебеларускі зьезд працаўнікоу асьветы.

У Менску ў траўні месяцы адбыўся Усебеларускі зьезд працаўнікоў асьветы аб якім газэта „Сав. Беларусь" піша:

„У справе будаўніцтва новай беларускай культуры настаўнік меў перад сабою сьвежую,нечапаную глебу. І трэба сказаць, што на гэтай беларускай глебе ён шмат зрабіў, як-бы яму цяжка ні было пры частых недахватах матэр'ялаў для сваёй працы.

Настаўнік у беларускай вёсцы цяпер зьяўляецца ў культурным сэнсе правадыром працоўнага сялянства. Ен зьяўляецца як-бы мазгамі вёскі Аб фактах ня будзем тут гаварыць — яны вядомы кожнаму.

А калі сярод настаўніцтва ёсьць яшчэ пэўны процант адсталых ад сучаснага жыцьця, дык з гэтай часткай змагаецца само настаўніцтва.

Калі мы зірнём на тое, што робіцца з беларускай школай у Польшчы у якім занялпадзе яна там знаходзіцца,—дык тады толькі прыкмеціш велізную работу, якую зрабілі ў нас настаўнікі ў справе адраджэньня беларускай культуры.

У Савецкай Беларусі рукамі нашых школьных працаўнікоў куецца новая беларуская культура, творыцца тая работа, якая заўсёды і моцна зьвязвае пралетарскі горад з працоўнай вёскай.

Цяперашні Усебеларускі зьезд працаўнікоў асьветы, робячы агляд пройдзенаму шляху, намеціць сабе плян будучай творчай працы, і новы вучэбны год яшчэ болей узмацніць і ўпэўніць нашыя надзеі ў выпаўненьні настаўнікамі вялікага абавязку—быць моцнымі будаўнікамі новай культуры, новай ідэолёгіі."

З Вільні.

— У часе цяперашняга набору прызыўных ваўжаная, што ў памешканьнях, дзе адбываецца набор, раскідана шмат камуністычных пракламацый, паліцыя ых праз Саюз Моладзі Пралетарыяту Гарадоў і Вёсак пад назвай „Вайна — Вайне" і заклікаючых да спрацыву ў часе набору і ухіляньня ад яго. Паліцыя заподазрыла нейкага М. Юшкевіча і пачала за ім сачыць. Агенты палітычнай паліцыі ня спушчалі з яго вока і йшлі за ім у сьлед і дайшлі такім чынам да дому № 6 пры Цэдровай вуліцы, куды ўвайшоў Юшкевіч. Зроблены быў вобыск і Юшкевіча застали пры друкаваньні пракламацый. У памешканьні было шмат камуністычных адозваў у беларускай і расейскай мовах, польскія адозвы яшчэ друкаваліся, Юшкевіч арыштаваны, а адозвы сканфіскавана. Гаспадар памешканьня ў адной бялізьне здолаў выскачыць праз вакно і ўцёк.

— Работнікі гарбарскіх прадпрыемстваў зажадалі платы на 100%, вызначаючы сераду апошнім тэрмінам задаваленьня іх жаданьняў. Уласьнікі не прынялі да гэтага дня варункаў і работнікі забаставалі.

Наша пошта.

К-чу з Пружан. За прысланыя 100.280 п. м. на прэсовы фонд, сабраныя па падпісному лісту, шчыра дзякуем. Пішыце часьцей, што чуваць у вашым баку. Вельмі пажадана хоць бы кароткае апісаньне адбываюшагося цікавага факта на вёсцы.

Сельска-гаспадарчыя рады.

Ці патрэбна трава у садзе?

Ведома, непатрэбна. Асабліва такая трава, якую найчасьцей можна бачыць у садкох і нават у вялікіх садох нашых сялян. Гэта больш усяго самая горкая трава з шырокімі лісьцямі, якой ніякая жывёла ня хоча есьці. Яе, як бачыце, няма гаспадару карысьці, а саду яна вельмі шкодзіць, высмоктваючы сок з глебы, які пашоў бы на карысьць садовым расьлінам. Наогул, якая б ня была трава, а яна у садзе непатрэбна, бо у траве знаходзяць сабе прытулак усякія рабакі і казякі, якія у свой час палазуць на дрэва і будуць шкодзіць альбо цьвету, альбо дрэву, альбо садавіне.

Сад трэба араць. Калі ня кожны год, дык час ад часу — гады праз тры-чатыры. Асабліва гэтага патрабуе стары сад, бо перакопваючы толькі пад самым дрэвам не дасягаецца мэты, дзеля таго, што канцы карэнеу, якія галоўным чынам здабываюць страву для дрэва, — знаходзяцца далека ад пня дрэва, дзе калі не араць саду, глеба будзе дзірваном.

Калі сад малады, альбо вельмі густы, дык можна садзіць бульбы кармавыя буракі, боб, гарох і іншую гародніну, якая патрабуе поліва абворваньня, абкопваньня. Менш пажадана у садзе расьліны збажавы і харчовых трау, асабліва канюшыны, бо яна, пускаючы глыбока карэньні, сушыць глебу. Але калі сенца мала дастае зямлю і можна думаць, што гароднiна будзе расьці дрэнна, дык, чым пакідаць сад зарастаць горкаю травою лепш пасеяць авес з вікаю, ціма феяку і інш. травы. Вельмі карысна было-б расьціць у садзе травы на лякарства.

Трэба ведаць і вучыцца як найвыгаднэй скарыстаць кожны крок зямелькі. У гэтым багацьце селяніна-хлебароба.

Курс на грошы.

Варшава 15 чэрвеня.

Доляры	95.200—93.000
Англійскія фунты	454.000—445.000
Нямецкая марка	84—82
Франкі	6.300—6.040
10 руб. золатам	545.000—530.000

Рэдактар-выдавец Я. Лагіновіч. Друкарня Левін і Сын, Нямецкая 22.